PRAYER
316

# Як мне маліцца?

**Як я размаўляю з Богам?** Малітва – гэта размова з Богам. У Бібліі Бог гаворыць да нас. Даведайся, што Біблія кажа пра малітву. *«як Ён* [Ісус] *у адным месцы маліўся, калі перастаў, адзін з вучняў Ягоных сказаў Яму: «Госпадзе! Навучы нас маліцца, як і Ян навучыў вучняў сваіх».* Лукі 11:1. Маліся такой самай малітвай. Біблейскае вучэньне пра малітву ўключае ў сябе: усхваленне, падзяку, спавяданьне грахоў, прашэньні. Усхваленне ўзносіць, шануе і праслаўляе Бога, Псальм 34:1-3. *«Дык будзем праз Яго прыносіць Богу няспынна ахвяры хвалы»* Гебраяў 13:15. Малітва падзякі ўзносіцца за тое, што Бог зрабіў. *«Добра славіць ГОСПАДА і выслаўляць імя Тваё, Найвышэйшы!»* Псальм 92:1. Спавяданьне грахоў адбываецца праз здзейсьненыя намі грахі. *«Калі вызнаем грахі нашыя, Ён верны і праведны, каб дараваць нам грахі і ачысьціць нас ад усякае няправеднасьці»* 1 Яна 1:9. Мы ўзносім малітвы прашэньня Богу, таму што Ён заклікае нас зьвяртацца да Яго. *«Не турбуйцеся ні пра што, але ў-ва ўсякай малітве і просьбе з падзякай няхай адкрываюцца жаданьні вашыя перад Богам»* Філіпянам 4:6. Просьбы да Бога задаволіць вашыя духоўныя і фізічныя патрэбы можна знайсьці ў Малітве Госпада ў Эвангельлі паводле Мацьвея 6:9-13. Малітва - гэта ваш асаблівы прывілей і магчымасьць зьвярнуцца да жывога Бога. *«Вочы ГОСПАДА — на праведных, і вушы Ягоныя — на лямант іхні»* Псальм 34:15. *«Таму кожны багабойны будзе маліцца»* Псальм 32:6.

**Дзе мне маліцца?** Добра маліцца ў культавых збудаваннях і на сустрэчах. Аднак, Ісус сказаў: *«Бог ёсьць Дух, і тыя, якія пакланяюцца Яму, павінны пакланяцца ў духу і праўдзе"* Яна 4:24. Дзейсная малітва насамрэч не залежыць ад вашага месцазнаходжаньня. Ісус сказаў: *«І калі молішся, ня будзь, як крывадушнікі, бо яны любяць у сынагогах і на вуглах вуліцаў, спыніўшыся, маліцца, каб паказацца перад людзьмі. Сапраўды кажу вам, што яны ўжо атрымліваюць нагароду сваю. Ты ж, калі молішся, увайдзі ў пакой твой і, зачыніўшы дзьверы твае, памаліся Айцу твайму, Які ўтоены, і Айцец твой, Які бачыць утоенае, дасьць табе яўна»* Мацьвея 6:5-6. Дзейсная малітва не залежыць ад месца малітвы. Яна залежыць ад стану вашага сэрца. Маліцеся публічна. Маліцеся ў адзіноце.

**Ці павінен я маліцца на каленях?** Ісус, Павал і Даніїл так маліліся. Мы можам гэта пабачыць у Эвангельлі паводле Лукі 22:41, Дзеях апосталаў 20:36, кнізе прарока Данііла 6:10. Маліцеся на каленях. Аднак, іншыя людзі ў Бібліі маліліся стоячы, узіраліся ў нябёсы, выцягвалі рукі ці ўздымалі ўгару, упадалі ніцма, паварочваліся да сьцяны. Поза пад час малітвы мае значэнне толькі таму, што яна адлюстроўвае стан вашага сэрца.

**Як мне маліцца?** Тое, *як* мы молімся, зьяўляецца не менш важным, а мабыць і больш важным за *сутнасць*нашай малітвы. Біблейская малітва – гэта адкрытае і шчырае раскрыццё вашай душы перад Богам. Не існуе нейкай адмысловай камбінацыі словаў, выразаў, ці сказаў для малітвы, інакш кажучы, сродкаў, каб прымусіць Бога неадкладна даць вам тое, аб чым вы Яго просіце. Біблейскія ж настаўленьні і прыклады ўключаюць наступныя:

Маліцеся з ўдзячным сэрцам, 1 Тэсалонцам 5:18.

Маліцеся шчыра, а не механічна, Ісаі 29:13.

Маліцеся без безсэнсоўных паўтарэньняў, Мацьвея 6:7.

Маліцеся адкрыта, проста і шчыра, Ісаі 37:14-17.

Маліцеся з пасьвячэньнем і настойлівасьцю, Каласянам 4:2, Лукі 11:5-10, 18:1-8.

Маліцеся пастаянна і без прымусу, Тэсалонцам 5:17.

Маліцеся з вялікай руплівасьцю, Рымлянам 15:30.

Маліцеся ў еднасьці з іншымі вернікамі, Мацьвея 18:19-20, Цімафея 2:8.

Маліцеся з вялікай верай, Якуба 1:6-7, Гебраяў 11:6.

Маліцеся згодна з Божай воляй, Яна 15:7, 1 Яна 5:14-15.

Маліцеся ў імя Ісуса, згодна з Яго воляй і як Яго прадстаўнік, Яна 14:13, 15:16.

**Пра што мне маліцца?** У Малітве Госпада, Ісус настаўляе Сваіх вучняў маліцца за свае штодзённыя фізічныя і духоўныя патрэбы. У Сваёй малітву ў 17-ым раздзеле Эвангельля паводле Яна, Ісус маліўся за Сябе, Сваіх вучняў і ўвесь сьвет. Ісус абяцаў, што малітва з верай, згодна з Яго воляй, якая будзе зьвернута да Айца, у Ягонае імя атрымае адказ, Яна 15:7, 16, 16:23, 1 Яна 5:14-15. Іншыя біблейскія інструкцыі і прыклады тэмаў для малітвы ўключаюць:

Мудрасьць, Якуба 1:5, 2 Летапісаў 1:7-12.

Духоўны плён, Каласянам 1:9-12.

Тых, хто вас крыўдзіць, Лукі 6:28.

Магчымае сцаленьне, Якуба 5:14-15, але не для ўсіх - 2 да Карынцянаў 12:7-9.

Адзін за аднаго, Эфесцам 6:18, Якуба 5:16.

За ваш урад, 1 Цімафея 2:1-2.

За вашую ежу, Мацьвея 6:11, Марка 6:41, 8:6-7.

За тых, хто мае патрэбу ў Хрысьце, Рымлянам. 10:1.

За працаўнікоў на ніве Эвангельля, Мацьвея 9:37-38.

За адчыненыя дзьверы для Эвангельля, Каласянам 4:3-4.

**Бог чуе і адказвае на вашыя малітвы.** Маліцеся згодна з Божай задумай і Ён адкажа вам. Божымі адказамі могуць быць: *так, Адтэрмінаванае так,* альбо *не.* Ён можа даць вам значна больш, чым вы просіце ці думаеце, Эфесцам 3:20. Божае адтэрмінаванае так можа падрыхтаваць вас ці іншых да Яго станоўчага адказу. Ці Яго адказ можа быць катэгарычным *не*. Маліцеся з верай у Яго і цалкам давярайце Яго адказам.

Матыў вашай малітвы мае значэньне. *«Просіце і не атрымліваеце, бо блага просіце, каб выдаткаваць дзеля асалоды вашай»* Якуба 4:3.

Мужы, добра стаўцеся да вашых жонак. Біблія навучае, што муж мусіць кахаць жонку, як Хрыстос Сваю царкву, клапаціцца пра яе, разумець яе, і шанаваць яе як раўнапраўную спадчыньніцу ласкі жыцьця. *«Каб не было перашкоды ў малітвах вашых»* 1 Пятра 3:7.

Даруйце іншым. Непрабачэньне стрымлівае вашыя малітвы. Вашае прабачэньне іншых дэманструе прабачэньне, якое вы чакаеце ад Бога, Марка 11:25, Мацьвея 5:23-24, 6:12-15. Будзьце пабожныя.

Будзьце духоўна чыстыя перад Богам, і вашыя малітвы змогуць многае. *«Малітвы правых Яму даспадобы»* Прыповесьцяў, 15:8. Аднак, калі хтосьці адварочваецца ад Ягонага закона: *«Таго малітва — брыдота»* Прыповесьцяў, 28:9. Бог абараняе, рыхтуе і ўдасканальвае вас. Адмовы і адтэрмінаваньні могуць быць для вашай карысьці.

Бог абараняе вас, калі вы не ведаеце, што тое, аб чым вы просіце пашкодзіць вам. Бог ведае вас значна лепей, чым вы самі. Часам Бог адказвае «не», таму што ведае будучыню і ведае, што для вас найлепш. Часам адмовы і адтэрмінаваньні дадзеныя вам, каб вы мелі час падрыхтавацца да Ягонага адказу. Часам Яго адмовы і адтэрмінаваньні патрэбныя, каб узмацніць вашую веру. Прыміце Божыя адказы з верай і падзякай. Бог ведае, што Ён робіць. Гаварыце з Богам. Ён слухае. Маліцеся!

**«За ўсё дзякуйце, бо такая для вас воля Божая ў Хрысьце Ісусе» 1 Тэсалонцам, 5:18**

---

*Як мне маліцца?* © 2026 Джона Д. Морыса III апублікавана служэннем Acts One Eight. Вы можаце свабодна друкаваць, капіраваць, публікаваць і дасылаць як паведамленне пры ўмове захавання нязменнасці зместу і ўключэння гэтай заявы. Вы можаце дадаць назву вашага служэньня ці царквы ў верхняй частцы першай старонкі і дадаць кантактныя звесткі над тлустай рысай унізе другой старонкі. Prayer316 грунтуецца выключна на Бібліі. Гэты праэкт існуе, каб дапамагчы людзям маліцца і расці ў іх веры ў Бога. Вы можаце даслаць мэйл Acts One Eight (па-магчымасьц, іпа-ангельску) на адрэсу: *Hello@Mail316.org*. Пераклад выкананы www.ChristianLingua.com. *Як мне маліцца* дасяжны на 48 мовах бясплатна на сайце *www.Prayer316.org*. Біблейскія цытаты ў арыгінальнай англійскай версіі ўзятыя з The Lockman Foundation’s New American Standard Bible 1995. Біблейскія цытаты ў дадзенай версіі ўзятыя з Бібліі Антонія Бокуна, 2023.